# АДЛЮСТРАВАННЕ ПРАБЛЕМЫ КРЭЎСКАЙ УНІІ 1385 Г. У ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Л.В. Мікалаева
УА "БДУІР" (Мінск)

Адным с дыскусійных пытанняў у гісторыі дачыненняў Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) з'яўляецца праблема Крэўскай уніі 1385 г., якая мае багатую гістарыяграфічную традыцыю. У ліку аспектаў, што выклікаюць спрэчкі сярод навукоўцаў, яскрава вылучаюцца тры асноўныя напрамкі: 1) прычыны і ініцыятар заключэння крэўскага пагаднення; 2) сам Крэўскі акт, яго характар, асобныя палажэнні, асабліва трактоўка тэрміна applicare, які па-рознаму перакладаецца і інтэрпрэціруецца; 3) аўтэнтычнасць Крэўскага акта. Пэўная характарыстыка гэтых напрамкаў дыскусіі была зроблена ў канцы XX ст. Г. Блашчыкам [1, s. 195 – 277].

У польскай гістарыяграфіі існуюць два супрацьлеглыя меркаванні адносна ініцыятараў заключэння пагаднення ў Крэве. Большасць даследчыкаў яшчэ з XIX ст. лічаць, што ініцыятыва зыходзіла з польскага боку, прыводзячы ў якасці аргументацыі звесткі аб падзеях, што папярэднічалі ўніі, і тон зместу Крэўскага акта. У сваю чаргу, Л. Калянкоўскі бачыў ініцыятараў уніі на ліцвінскім баку [2, s. 70]. Аналізуючы тагачаснае геапалітычнае становішча ВКЛ, гэты погляд развівалі Х. Пашкевіч [3, s. 339] і Ю. Бардах [4, с. 24, 32 – 33]. Е. Ахманьскі [5, s. 68] і Х. Віснер [6, s. 36] лічаць, што праблема ініцыятара падпісання ўніі ў Крэве яшчэ адназначна не вырашана.

Адносна характару Крэўскага акта польскімі даследчыкамі таксама выказывюць самыя розныя мераванні. Так, С. Закшэўскі называе яго "першым прэлімінарыям польска-літоўскага пагаднення" ці "пратаколам перагавораў" [7, s. 354]. На думку Ф. Канечнага, гэта была "ратыфікацыя папярэдніх пагадненняў" [8, s. 194]. Л. Калянкоўскі сцвярджае, што гэта быў "пералік вынікаў папярэдніх пагадненняў" [2, s. 33]. С. Кутшэба лічыць, што гэты была "канстатацыя абавязацельстваў з боку Літвы" [9, s. 456]. Е. Ахманьскі выказваецца на карысць таго, што гэта быў "дакумент, які вызначаў умовы ўніі" [5, s. 75]. Больш асцярожна выказваецца Х. Пашкевіч, які мяркуе, што гэты дакумент "меў выключна папярэдні характар" і быў "абяцаннем выканання абавязацельстваў" [3, s. 339]. Погляды польскіх даследчыкаў супадаюць у тым, што дакумент, падпісаны ў Крэве 15 жніўня 1385 г., з фармальнага пункта гледжання, не з'яўляецца актам польска-літоўскай уніі. Па вызначэнні Г. Блашчыка, гэта было "падвядзенне вынікаў польска-літоўскіх перагавораў" [1, s. 196]. Зыходзячы з вышэйсказанага, сучасная польская гістарыяграфія пазбягае тэрміна "Крэўская ўнія", ужываючы вызначэнне "Крэўскі акт", якое з'яўляецца больш дакладным.

Адным з аспектаў дыскусіі аб характары Крэўскага акта з'яўляюцца спрэчкі вакол прынцыповага для яго інтэрпрэтацыі тэрміна applicare ў пасажы

апошняга пункта Крэўскага акт, які гучыць так: “Demum etiam Jagalo dux saepedictus promittit terras suas Lituaniae et Russiae Coronae Regni Poloniae perpetuo applicare” [“Напрыканцы той частазгадваны князь Ягайла паабяцаў навечна далучыць свае землі Літвы і Русі да Кароны Каралеўства Польскага”] [10, s. 2]. Мнагазначнасць ужывання тэрміна applicare ў перыяд Сярэднявечча раскрывала шырокае поле для яго інтэрпрэтацыі, ад якой залежала разуменне таго, у якім міжнародна-палітычным становішчы апынулася ВКЛ пасля прыняцця Крэўскага акта.

Яшчэ ў канцы XIX ст. А. Лявіцкім была сфармулявана тэорыя інкарпарацыі, у адпаведнасці з якой пасля Крэўскага акта ВКЛ перастала існаваць як дзяржава і было пераўтворана ў шэраг правінцый Каралеўства Польскага, і толькі дагавор з Тэўтонскім Ордэнам на в. Салін у 1398 г. і акты Віленска-Радамскай уніі 1401 г. рэаніміравалі яго як асобную дзяржаву [11]. С. Кутшэба ўдакладніў канцэпцыю і прыйшоў да высновы, што applicare з’яўляецца сінонімам тэрміна incorporatio, і падтрымаў меркаванне аб тым, што ВКЛ было далучана да Польскага Каралеўства [9, s. 475]. Версію інкарпарацыі развіваў таксама Г. Лаўмяньскі, які паказаў, што юрыдычны сэнс тэрміна applicare ў дакументах таго часу азначаў далучэнне тэрыторый, а не ленную залежнасць, і выступаў на перамену з тэрмінам incorporare (уключыць) [12, s. 50]. У падтрымку тэорыі інкарпарацыі выказваўся таксама і Л. Калянкоўскі, які лічыў, што стан інкарпарацыі захоўваўся да абрання Казіміра Ягелончыка вялікім князем літоўскім у 1440 г. [2, s. 34; 13, s. 2 – 5].

Разам з тым рэальнасць інкарпарацыі ставілася пад сумненне многімі польскімі гісторыкамі, асабліва Я. Адамусам, О. Галецкім і Х. Пашкевічам. Я. Адамус адзначаў, што ўжо з моманту заключэння Востраўскага пагаднення 1392 г. інкарпарацыйныя тэндэнцыі пачалі прыходзіць у заняпад, а з 1398 г. і 1401 г. Вітаўт выступаў ужо як самастойны ўладар [14, s. 15 – 79; 15, s. 273 – 316]. Рэальнасць інкарпарацыі аспрэчваў таксама Х. Пашкевіч [3, s. 252], а пазней і Ю. Бардах [4, с. 30 – 32, 43]. У выніку была пастаўлена пад сумненне і сама інкарпарацыйная інтэрпрэтацыя Крэўскага акта.

У другой палове XX ст. пад сумненне была пастаўлена і аўтэнтычнасць акта ўніі. З катэгарычнымі абвяржэннямі сапраўднасці Крэўскага акта выступіў літоўскі эміграцыйны гісторык Ё. Даінаўскас у артыкуле, надрукаваным у 1976 г. у Чыкага, пераклад якога на польскую мову выйшаў у 1987 г. [16, s. 125 – 144]. Даследчык сцвярджаў, што так як акт быў апублікаваны толькі ў XIX ст., то раней яго, быццам бы, не ведалі прадстаўнікі польскай і літоўскай эліт, акрамя таго, формы ўжытых у тэксце тытулаў анахранічныя, а падвешаныя пячаткі не адпавядаюць сітуацыі жніўня 1385 г. Выклікаў сумненне і не маючы аналагаў фармуляр дакумента, а таксама тое, што ён захоўваўся не ў каралеўскім архіве на Вавелі, а ў архіве Кракаўскага капітула.

Артыкул Ё. Даінаўскаса справакаваў з’яўленне шэрагу публікацый польскіх медыявістаў, якія паказалі тэндэнцыйнасць і беспадстаўнасць яго сцвярджэнняў [17, s. 473 – 479]. Аргументаваная крытыка меркаванняў

Ё. Даінаўскаса была выказана ў фундаментальным артыкуле М. Качэрскай. Яна абвергла тэзіс аб тым, што Крэўскі акт стаў вядомы толькі ў XIX ст. Гэты дакумент быў вядомы і ў сярэдзіне XV ст. На яго спасылаецца ў сваёй хроніцы Ян Длугаш, які тэндэнцыйна пераказаў дакумент, замяніўшы applicare на incorporare. Зняты сумненні і адносна сапраўднасці пячатак і выкарыстанай у акце тытулатуры [18, s. 59 – 80]. Так, паступова праблема праўдзівасці самаго дакумента была знята, і ракурс спрэчак змясціўся ў напрамку пытання, ці можна яго называць актам "уніі" і г.д.

Такім чынам, Крэўская ўнія 1385 г. адносіцца да ліку найважнейшых падзей у гісторыі польска-ліцвінскіх адносін і ўсяго Цэнтральна- і Усходнееўрапейскага рэгіёна. Гэтым тлумачыцца існаванне даўняй і багатай польскай гістарыяграфічнай традыцыі па разнастайных аспектах праблематыкі гэтай падзеі.

Літаратура

1. Błaszczyk, G. Dzieje stosunków polsko-litewskich od czasów najdawniejszych do spółczesności: w 2 t./ G. Błaszczyk. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 1998 – 2007. – T. I. Trudne początki. – 1998. – 366 s.

2. Kolankowski, L. Dzieje Wielkiego księstwa Litewskiego za Jagiellonów/ L. Kolankowski. – Warszawa: Scład głowny: kasa im. Mianowskiego, 1930. – T. 1: 1377 – 1499. – 475 s.

3. Paszkiewicz, H. O genezie i wartości Krewa/ H. Paszkiewicz. – Warszawa: Gebeithner i Wolff, 1938. – 356 s.

4. Бардах, Ю. Крэва і Люблін. З праблемаў польска-літоўскае уніі/ Ю. Бардах// Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага [Тэкст]/ Ю. Бардах; пер. з пол. М. Раманоўскага, пер. з фр. А. Істоміна; уклад. Г. Сагановіч. – 2-е выд. – Мінск, 2010. – С. 16 – 99.

5. Ochmański, J. Historia Litwy/ J. Ochmański. – Wrocław etc.: Ossolineum, 1990. – 395 s.

6. Wisner, H. Unia. Sceny z przeszłości Polski i Litwy/ H. Wisner. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1988. – 327 s.

7. Zakrzewski, S. Wypadki z lat 1382–1386 w związku z genezą unii/ S. Zakrzewski// Pamiętnik V Zjazdu Historyków Polskich. – Lwów, 1930. – T. 1. – S. 345 – 354.

8. Koneczny, F. Jagiełło i Witołd (1382 – 1392)/ F. Koneczny// Przewodnik naukowy i literacki. – 1892. – R. XX. – T. XX. – Z. I. Styczeń. – 1096 s.

9. Kutrzeba, S. Unia Polski z Litwą/ S. Kutrzeba// Polska i Litwa w dziejowym stosunku. – Krakow etc., 1914. – S. 449 – 658.

10. Akta unji Polski z Litwą. 1385 – 1791/ wyd. S. Kutrzeba i W. Semkowicz. – Kraków: Skład główny w księgarni Gebethnera i Wolffa, 1932. – 633 s.

11. Lewicki, A. Powstanie Świdrygiełły/ A. Lewicki// Rozprawy Akademii Umięjetności. Wydział historyczno-filozoficzny. – Kraków, 1892. – Serya II. T. IV (29) – 389 s.

12. Łowmiański, H. Wcielenie Litwy do Polski w 1386 r. / H. Łowmiański // Lituano-Slavica Posnaniensia. – 1987. – T. 2. – S. 37 – 123.
13. Kolankowski, L. Polska Jagiellonów. Dzieje polityczne/ L. Kolankowski. – Lwów: Scład główny w księgarni Gubrynowicz i syn, 1936. – 374 s.
14. Adamus, J. Państwo litewskie w latach 1386 – 1389/ J. Adamus// Księga Pamiątkowa ku uczczeniu 400-letniej rocznicy wydania I Statutu Litewskiego/ pod redakcją Stefana Ehrenkreutza. – Wilno, 1935. – S. 15 – 79.
15. Adamus, J. Najnowsza literatura o akcie krewskim/ J. Adamus// Wiadomości Studium Historii Prawa Litewskiego Uniwersytetu Stefana Batorego. – Wilno, 1938. – T. 1. – S. 273–316.
16. Dainauskas, J. Autentyczność aktu krewskiego/ J. Dainauskas// Lituano-Slavica Posnaniensia. – 1987. – T. 2. – S. 125 – 142.
17. Korczak, L. O akcie krewskim raz jeszcze (na marginesie rozprawy J. Dainauskasa)/ L. Korczak// Studia Historyczne. – 1991. – R. 34. № 3. – S. 473–479.
18. Koczerska, M. Autentyczność dokumentu unii krewskiej 1385 r./ M. Koczerska// Kwartalnik Historyczny. – 1992. – R. 99. № l. – S. 59–80.